**Н.А.Радзіваноўская**

# Тыпалогія састаўных айконімаў, суадносных з назвамі расліннага свету

У айканімічнай сістэме Беларусі састаўныя айконімы, суадносныя з назвамі расліннага свету, складаюць невялікую групу. Усяго намі зафіксавана 311 такіх найменняў, якія з’яўляюцца назвамі 411 населеных пунктаў. Даная група айконімаў налічвае каля 17,8 % ад агульнай колькасці найменняў, суадносных з назвамі расліннага свету.

Састаўныя айконімы – гэта лексікалізаваныя словазлучэнні, якія складаюцца з апорнага (азначаемага) кампанента, выражанага назоўнікам, і атрыбутыўнага (азначальнага), якім можа быць прыметнік, назоўнік, лічэбнік, назоўнік з прыназоўнікам.

У залежнасці ад граматычнай будовы сярод састаўных айконімаў П.С. Будзько вылучае наступныя структурныя разнавіднасці: айконімы ў форме атрыбутыўных, прыназоўнікавых і недапасаваных словазлучэнняў [1, с. 52]. Разгледзім кожную структурную разнавіднасць састаўных айконімаў падрабязней.

***<u>Айконімы ў форме атрыбутыўных словазлучэнняў.</u>*** Атрыбутыўныя словазлучэнні звычайна складаюцца з двух кампанентаў – *субстантыўнага (азначаемага)* і *атрыбутыўнага (азначальнага)*. У якасці апорнага кампанента могуць выкарыстоўвацца лексемы апелятыўнага, тапанімічнага і антрапанімічнага паходжання, таму ёсць падставы вылучыць айконімы з апорнымі кампанентамі “апелятыў”, “тапонім” і “антрапонім”.

Паколькі мы разглядаем састаўныя айконімы, суадносныя з назвамі расліннага свету, то значная колькасць *субстантыўных кампанентаў* абазначае рэаліі расліннага свету (віды раслін, пароды дрэў, назвы частак раслін, лясныя масівы): *Асаўскі Бор (Чэрв.), Белы Бор (Лёзн., Сл.), Белая Ветка (Жлоб. да 1971), Бярозавы Гай (Раг.), Вострыя Ёлкі (Люб. да 1976), Вялікае Гарохавішча (Дзярж.), Вялікая Ліпа (Нясв.), Зялёная Рошча (Б.-Каш.,*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Зэльв., Кір., Краснап. да 1974, Раг., Расон., Слаўг., Чав.), Зялёны Мох (Маз., Салігор., Чач.), Красная Дуброва (Бабр.), Крывая Бяроза (Смал.), Малады Лес (Лун.), Малыя Калінавічы (Лёзн.), Светлая Рошча (Барыс.), Трохгранны Дуб (Чэрв.), Чорны Лес (Лаг., Смал.), Чырвоны Лес (Уздз.), Ясны Бор (Б.-Каш.)* і інш. Усяго пры аналізе фактычнага матэрыялу намі адзначаны 271 айконім, які з’яўляецца назвай 363 населеных пунктаў.

Таксама ў якасці апелятыўных апорных кампанентаў шырока выкарыстоўваюцца назвы, якія абазначаюць:

- асаблівасці рэльефу і зямельныя ўчасткі: *Баравое Ляда (Б.-Каш.), Бярозава Балота (Кліч. да 1981), Бярозавае Балота (Б.-Каш. да 1983), Бярозавая Гара (Смал.), Дубовая Града (Жлоб.), Дубовы Вугал (Гор.), Дубовы Лог (Барыс. – 2, Бяроз., Добр., Кліч. да 1975, Слаўг., Смал. да 1977, Чашн., Чэрв.), Ліпавы Рог (Бых. да 1982), Ліпаў Востраў (Міёр.), Лясны Востраў (Рэч. да 1922), Лясныя Азёры (Уш.), Малінаў Груд (Слон. да 1969), Рэпная Града (Кап.), Сасновае Балота (Бярэз.), Чырвоны Агарод (Бабр.), Яловы Груд (Каш.).* Адзначана 16 айконімаў, якія з’яўляюцца назвамі 24 населеных пунктаў;

- тыпы пасяленняў: *Асавецкая Буда (Маз.), Асінаўскія Навасёлкі (Докш. да 1971), Баравая Буда (Карм.), Баравая Слабада (Пух.), Залеская Слабада (Бых.), Замашанскае Дворышча (Шум.), Лесавая Буда (Карм.), Лясныя Дворышчы (Лід.), Рабінавая Слабодка (Чав.), Усохская Буда (Добр.).* Пры аналізе фактычнага матэрыялу адзначана 10 айконімаў, якія з’яўляюцца назвамі 10 населеных пунктаў;

- збудаванні і шляхі зносін: *Асінавы Мост (Чэрв. да 1979), Баравы Мост (Бярэз.), Бярозавыя Кладкі (Пруж. да 1976), Бярозаў Масток (Шч.), Дубраўскі раз’езд (Асіп. да 1971), Заельніцкі Мост (Светлаг. да 1939).* Усяго зафіксавана 6 айконімаў, якія з’яўляюцца назвамі 6 населеных пунктаў;

- вытворчыя прадпрыемствы: *Асінаўская Гута (Чач.), , Берасцяны Завод (Лельч. да 1969), Бярозава Пасека (Уздз.), Заборныя Гумны (Брасл.),*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Лозаўская Рудня (Б.-Каш.).* Занатавана 5 айконімаў, якія з'яўляюцца назвамі 5 населеных пунктаў;

У якасці *атрыбутыўных кампанентаў* у састаўных айконімах, суадносных з назвамі расліннага свету, выступаюць прыметнікі трох разрадаў – якасныя, адносныя і прыналежныя.

Якасныя прыметнікі ўказваюць на:

1) колер аб'екта: *Белая Дуброва (Касц., Чашн.), Белая Ліпа (Сен.), Белы Бор (Лёзн., Сл.), Белы Лясок (Пруж.), Белы Мох (Мсц.), Зялёная Дуброва (Асіп. да 1967, Ашм., Барыс., Б.-Каш., Кругл., Мсц. да 1976, Старадар., Уздз. да 1974), Зялёны Бор (Ашм., Ел., Івац., Лун., Салігор., Смал., Тал.), Зялёны Гай (Бых., Бярэз., Гом., Хойн.), Зялёны Мох (Маз., Салігор., Чач.), Красная Дуброва (Бабр.), Красны Бор (Карм. да 1966, Рэч. да 1962), Красны Лес (Бабр., Кліч.), Светлая Рошча (Барыс.), Цёмны Лес (Гор.), Чорная Лаза (Чашн.), Чорная Сасна (Мсц.), Чорны Бор (Астр., Бых., Смарг.), Чорны Лес (Лаг., Смал.), Чырвоная Дуброва (Акц. да 1962, Браг., Кап., Раг., Рэч.), Чырвоная Кветка (Рэч.), Чырвоны Бор ( Астр., Астр. да 1976, Бялын., Бярэз., Дзятл., Крыч., Лаг., Расон. – 2, Чав. да 1981, Чач.), Чырвоны Лес (Уздз.), Ясны Лес (Бабр.)* і інш. Усяго намі зафіксавана 38 айконімаў, якія з'яўляюцца назвамі 91 населенага пункта;

2) памер ці форму аб'екта: *Высокая Ліпа (Нясв.), Высокі Барок (Светлаг.), Высокі Борак (Краснап.), Высокі Дуб (Светлаг. да 1939), Вялікае Гарохавішча (Дзярж.), Вялікае Міжлессе (Бяроз.), Вялікае Падлессе (Лях.), Вялікае Рэпішча (Мядз.), Вялікая Крушынаўка (Раг.), Вялікая Ліпа (Нясв.), Вялікая Малінаўка (Уздз.), Вялікая Мухамораўшчына (Шкл.), Вялікія Ліпавічы (Чашн.), Доўгая Дуброва (Жытк., Хоц.), Доўгі Бор (Расон.), Доўгі Лес (Глуск.), Доўгі Мох (Чав.), Круглы Бор (Іўеў.), Круглы Лес (Стол.), Крывая Бяроза (Смал.), Крывы Лес (Пін. да 1975), Малая Крапіўня (Касц.), Малая Крушынаўка (Раг.), Малая Ліпаўка (Хоц. да 1975), Малое Падлессе (Лях.), Малы Бор (Глыб. да 1973, Мал.), Малы Восаў (Краснап.), Тоўсты Дуб (Лун.), Тоўсты Лес (Глуск. да 1977, Уздз.), Трохгранны Дуб (Чэрв.)* і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пры аналізе фактычнага матэрыялу ўсяго выяўлена 103 айконімы, якія з’яўляюцца назвамі 127 населеных пунктаў;

3) часавую характарыстыку аб’екта: *Малады Лес (Лун.), Новае Залессе (Чач.), Новая Дуброва (Акц., Лёзн., Люб., Шч.), Новая Ёлча (Браг.), Новая Ельня (Краснап.), Новая Ліпа (Б.-Каш.), Новая Ліпніца (Кліч. да 1975), Новая Яблынька (Тал.), Новая Ясенка (Краснап.), Новы Бор (Стол.), Новы Дубок (Чэрв.), Старая Дуброва (Акц., Люб.), Старая Ёлча (Браг.), Старая Ліпніца (Кліч. да 1975), Стары Дуб (Мсц. да 1976, Салігор. да 1974), Стары Лес (Навагр.), Старыя Набаркі (Кліч.), Старыя Паддубы (Шч.)* і інш. Усяго намі занатаваны 41 айконім, які з’яўляецца назвай 47 населеных пунктаў;

4) станоўчую ці адмоўную характарыстыку аб’екта: *Вясёлы Гай (Пух.), Вясёлая Дуброва (Хоц.), Добры Дуб (Слаўг.), Люты Бор (Стол.).* Адзначаны 4 айконімы, якія з’яўляюцца назвамі 4 населеных пунктаў;

5) іншыя адзінкавыя прыкметы: *Палы Бор (Лун.), Гарачы Лес (Шч.), Голы Барок (Кам.), Голы Бор (Астр.), Грымячы Мох (Жлоб.), Густая Дуброва (Светлаг. да 1939), Жалезная Баравіна (Кліч.), Казённыя Боркі (Уздз.), Мокрая Дубрава (Пін.), Палескае Косава (Івац.), Паўднёвы Колас (Рэч. да 1969), Смаловыя Лозкі (Б.-Каш.), Сухі Барок (Іўеў., Лун.), Сухі Бор (Віл., Ів. да 1972, Пол.), Чысты Бор (Лаг.).* Занатавана 15 такіх айконімаў, якія з’яўляюцца назвамі 18 населеных пунктаў.

Дамінуючай прыкметай аб’ектаў, на якую ўказваюць якасныя прыметнікі, з’яўляюцца яго памер ці форма (103 айконімы, якія называюць 127 неселеных пунктаў).

Атрыбутыўныя кампаненты састаўных айконімаў, выражаныя адноснымі прыметнікамі, указваюць на:

1) месцазнаходжанне аб’екта. Зафіксавана 17 айконімаў, якія з’яўляюцца назвамі 17 населеных пунктаў: *Горная Крапіўна (Арш.), Горная Рута (Кар.), Горныя Руткавічы (Кар.), Дольная Рута (Кар.), Заборныя Гумны (Брасл.), Заводны Лес (Слон.), Задні Бор (Кругл. да 1975), Заельніцкі Мост (Светлаг. да 1939), Залеская Слабада (Бых.), Залескі Бор (Свісл.),*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Замашанскае Дворышча (Шум.), Зарэчнае Падбярэззе (Тал.), Ніжняя Баравая (Пол. да 1949), Нізавыя Баркі (Валож.), Пагорныя Чарэмушкі (Паст.), Падзісення Чарэмушкі (Паст.), Паўднёвы Колас (Рэч. да 1969).*

2) віды раслін і жывёл, якасць глебы. Выяўлена 70 такіх айконімаў, якія з’яўляюцца назвамі 83 населеных пунктаў: *Асаўскі Бор (Чэрв.), Асінавы Мост (Чэрв. да 1979), Асінаўская Гута (Чач.), Баравая Буда (Карм.), Баравая Глінка (Карм.), Баравая Слабада (Пух.), Барсучы Мох (Паст.), Бярозава Балота (Кліч. да 1981), Бярозава Пасека (Уздз.), Бярозавае Балота (Б.-Каш.), Бярозавая Гара (Смал.), Бярозавая Рошча (Б.-Каш., Смарг.), Воўчыя Баркі (Чэрык. да 1971), Вязаў Лес (Жытк.), Драздова Лаза (Бых.), Дубовая Града (Жлоб.), Дубовы Вугал (Гор.), Дубовы Лес (Мін.), Дубовы Лог (Барыс. – 2, Бяроз., Добр., Кліч. да 1975, Слаўг., Смал. да 1977, Чашн., Чэрв.), Лазовы Куст (Смал.), Лесавая Буда (Карм.), Рабінавая Слабодка (Чав.), Руда Яварская (Дзятл.), Рэпная Града (Кап.), Сасновае Балота (Бярэз.), Сасновая Наспа (Лёзн.), Сасновы Бор (Мал., Пол., Расон., Сетлаг., Шч.), Скаменны Бор (Лід.),, Усохская Буда (Добр.), Хвойная Паляна (Хойн.), Шчучы Бор (Іўеў.), Яловы Груд (Кам.)* і інш.

Атрыбутыўныя кампаненты ў форме прыналежных прыметнікаў звычайна суадносяцца з антрапонімамі, радзей з агульнымі імёнамі, і ўказваюць на прыналежнасць пэўнаму ўладальніку. Адзначана 13 айконімаў, якія з’яўляюцца назвамі 14 населеных пунктаў: *Бабі Лес (Смал.), Дзедзін Бор (Чэрв. да 1979), Іванаў Бор (Уздз.), Камісарскі Сад (Бярэз., Чэрв.), Краўчая Дуброва (Светлаг. да 1939), Лапцінскі Бор (Бялын. да 1977), Новікаўская Рошча (Гом.), Нясоеў Барок (Жлоб.), Раманаў Лес (Ветк.), Савін Дуб (Леп.), Саўскі Бор (Леп.), Церахаў Бор (Кліч.), Чумачоў Мох (Віц.).*

Вядомы беларускі анаматолаг В.П. Лемцюгова выдзяляе таксама групу адносна-прыналежных прыметнікаў. Атрыбутыўны кампанент такіх састаўных айконімаў указвае на адносную прыналежнасць новай назвы да старой [2, с. 146]. Намі выяўлена 18 такіх айконімаў, якія з’яўляюцца назвамі 18 населеных пунктаў: *Асаўскі Бор (Чэрв.), Баярская Дубіна (Валож.),*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Блужскі Бор (Мал.), Вольніцкі Бор (Кліч. да 1968), Вяршыцкая Дубіна (Валож.), Гараднянскі Мох (Віц.), Закрашынскі Мох (Рэч.), Камянецкае Падлессе (Брэсц.), Картузская Бяроза (Бяроз. да 1940), Касцінская Бяроза (Кобр.), Крупенскі Мох (Глыб.), Ліпічанская Пушча (Дзятл.), Новікаўская Рошча (Гом.), Равецкі Лес (Салігор.), Радваніцкае Падлессе (Брэсц.), Руднецкі Лес (Раг.), Саская Ліпка (Нясв.), Чарнецкі Мох (Віц.).*

<u>Айконімы з апорным кампанентам “тапонім”.</u> У беларускай айканіміі налічваецца значная колькасць назваў, утвораных на аснове тапонімаў. Апорным словам у такіх састаўных найменнях выступае тапонім. Атрыбутыўнымі кампанентамі служаць прыметнікі, якія выконваюць дыферэнцыруючую функцыю і ўтвараюць антанімічныя пары [1, с. 57]. У аснову размежавання айканімічных назваў пакладзены розныя прыкметы. Найбольш частыя ў беларускай айканіміі наступныя:

1) вялікі – малы, якія ўказваюць на памеры населеных пунктаў: *Вялікае Барава (Іўеў.) – Малое Барава (Іўеў.), Вялікае Гарохавішча (Дзярж.) – Малое Гарохавішча (Дзярж.), Вялікае Замошша (Шкл.) – Малое Замошша (Шкл.), Вялікае Міжлессе (Бяроз.) – Малое Міжлессе (Бяроз. да 1972), Вялікае Падлессе (Лях.) – Малое Падлессе (Лях.), Вялікая Дубраўка (Маг.) – Малая Дубраўка (Маг.), Вялікая Крапіўня (Касц.) – Малая Крапіўня (Касц.), Вялікая Крушынаўка (Раг.) – Малая Крушынаўка (Раг.), Вялікая Ліпаўка (Хоц. да 1975) – Малая Ліпаўка (Хоц. да 1975), Вялікая Малінаўка (Уздз.) – Малая Малінаўка (Уздз.), Вялікі Восаў (Краснап.) – Малы Восаў (Краснап.), Вялікі Вязок (Круп.) – Малы Вязок (Круп.), Вялікі Добры Бор (Бар.) – Малы Добры Бор (Бар.), Вялікія Канюшаны (Лід.) – Малыя Канюшаны (Лід.), Вялікія Лазіцы (Шкл.) – Малыя Лазіцы (Шкл.), Вялікія Ліпавічы (Чашн.) – Малыя Ліпавічы (Чашн.), Вялікія Ліпнікі (Тал.) – Малыя Ліпнікі (Тал.), Вялікія Укропавічы (Лаг.) – Малыя Укропавічы (Лаг.), Вялікія Хварасцяні (Лаг. да 1976) – Малыя Хварасцяні (Лаг. да 1976)* і інш. Усяго на тэрыторыі Беларусі зафіксавана 34 такія антанімічныя пары айконімаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2) стары – новы, якія сведчаць пра час узнікнення населеных пунктаў: *Новае Палессе (Кругл.) – Старое Палессе (Кругл.), Новая Алешня (Раг.) – Старая Алешня (Раг.), Новая Арэхаўка (Кліч. да 1967) – Старая Арэхаўка (Кліч. да 1967), Новая Бярэзіна (Іўеў.) – Старая Бярэзіна (Іўеў. да 1976), Новая Дубавая (Гродз.) – Старая Дубавая (Гродз.), Новая Дуброва (Акц., Люб.) – Старая Дуброва (Акц., Люб.), Новая Ёлча (Браг.) – Старая Ёлча (Браг.), Новая Ліпніца (Кліч. да 1975) – Старая Ліпніца (Кліч. да 1975), Новая Траўна (Краснап. да 1976) – Старая Траўна (Краснап. да 1976), Новыя Замшаны (Пол.) – Старыя Замшаны (Пол.), Новыя Клёнкі (Ів.) – Старыя Клёнкі (Ів.), Новыя Набаркі (Кліч.) – Старыя Набаркі (Кліч.).* Адзначана 12 такіх антанімічных пар айконімаў.

3) I, 1, першы – II, 2, другі і г.д. Дыферэнцыруючую функцыю тут выконваюць парадкавыя лічэбнікі. *Альшанікі I (Кругл.) – Альшанікі II (Кругл.), Альшоў I (Хоц.) – Альшоў II (Хоц.), Амхавая I (Маг.) – Амхавая II (Маг.), Асінаўшчына I (Смарг.) – Асінаўшчына II (Смарг.), Баркі I (Шкл.) – Баркі II (Шкл.) – Баркі III (Шкл.) - Баркі IV (Шкл.), Бор I (Мал. да 1971) – Бор II (Мал. да 1971) – Бор III (Мал. да 1971) – Бор IV (Мал. да 1971) – Бор V (Мал. да 1971), Бярозаўка I (Брэсц. да 1958) – Бярозаўка II (Брэсц. да 1958), Дубраўка I (Карм. да 1962, Шкл.) – Дубраўка II (Карм. да 1962, Шкл.), Забор'е II (Расон.), Замошша I (Іўеў., Пол., Уш.) – Замошша II (Іўеў., Пол., Уш.), Ліпава I (Міёр.) – Ліпава II (Міёр., Мядз.), Ліпаўкі I (Міёр.) – Ліпаўкі II (Міёр.) – Ліпаўкі III (Міёр.), Ляскі I (Добр. да 1974) – Ляскі II (Добр. да 1974), Пушча I (Лаг.) – Пушча II (Лаг.) – Пушча III (Лаг.), Рамашкі I (Глыб.) – Рамашкі II (Глыб.), Рутка I (Навагр.) – Рутка II (Навагр.), Сасновіца I (Краснап.) – Сасновіца II (Краснап.), Чарніца I (Докш.) – Чарніца II (Докш.), Чарнічка I (Докш.) – Чарнічка II (Докш.) – Чарнічка III (Докш.) – Чарнічка IV (Докш.)* і інш. Усяго намі зафіксавана 32 пары такіх айконімаў.

Варта адзначыць, што словы *вялікі – малы* зараз не заўсёды ўказваюць на памер канкрэтнага аб'екта, а выконваюць толькі адрознівальную функцыю, бо па розных сацыяльна-эканамічных прычынах у працэсе

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

працяглага гістарычнага развіцця ў мінулым малыя населеныя пункты па сваіх памерах нярэдка пераўзыходзяць ранейшыя вялікія.

Аналіз сабранага фактычнага матэрыялу сведчыць, што найбольш прадуктыўныя ўтварэнні ў гэтай групе айконімаў антанімічныя пары з прыметнікамі *вялікі – малы* (каля 43,6% ад агульнай колькасці айконімаў з апорным кампанентам “тапонім”). Менш распаўсюджаны найменні, у якіх адрознівальны кампанент, выражаны лічэбнікамі (каля 41% ад агульнай колькасці назваў гэтай групы). Значна радзей ужываюцца ў састаўных айконімах прыметнікі *новы – стары* (каля 15,4%).

У якасці атрыбутыўнага кампанента ў састаўных айконімах ужываюцца адносныя прыметнікі, якія ўтвараюць антанімічныя пары. На Беларусі зафіксавана ўсяго 1 пара айконімаў, суадносных з назвамі расліннага свету: *Дольная Рута (Кар.) – Горная Рута (Кар.)*.

***<u>Айконімы ў форме прыназоўнікавых словазлучэнняў</u>***. Айконімы гэтага тыпу ўтвораны па мадэлі “прыназоўнік+назоўнік”. Намі занатавана 2 айконімы (2 населеныя пункты): *Пад Дубішчамі (Слон. да 1969), У Дуба (Светлаг. да 1939).* З цягам часу многія з такіх айконімаў у выніку зліцця прыназоўніка з назоўнікам перайшлі ў разрад прэфіксальных айконімаў.

***<u>Састаўныя айконімы ў форме недапасаваных словазлучэнняў</u>***. Абодва кампаненты такіх назваў выражаны назоўнікамі ў назоўным склоне. Сярод састаўных айконімаў, суадносных з назвамі расліннага свету, гэты тып непрадуктыўны. Намі адзначаны толькі 1 айконім (1 населены пункт): *Засценак Диброва (Раг. да 1964).*

Як адзначае П.С. Будзько, першапачаткова беларускія састаўныя айконімы ўзніклі ў выніку тапанімічнага пераасэнсавання назваў-словазлучэнняў часцей за ўсё на аснове тапанімічнай метаніміі. Пазней такія айконімы сталі ўтварацца ад ужо існуючых тапонімаў шляхам далучэння адрознівальных кампанентаў [1, с. 67].

Такім чынам, як сведчыць прыведзены матэрыял, найбольш распаўсюджанымі сярод састаўных айконімаў, суадносных з назвамі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

раслiннага свету, з'яўляюцца найменні ў форме атрыбутыўных словазлучэнняў. Прадуктыўнасць структурных разнавіднасцей састаўных айконімаў паказана ў табліцы .

| **Словаўтваральныя мадэлі** | **Колькасць назваў** | |
|---|---|---|
| | **У адзінках** | **У працэнтах** |
| Атрыбутыўныя словазлучэнні | 308 (408 н.п.) | 99,04 % |
| Прыназоўнікавыя словазлучэнні | 2 (2 н.п.) | 0,64 % |
| Недапасаваныя словазлучэнні | 1 (1 н.п.) | 0,32 % |
| Усяго | 311 (411 н.п.) | 100 % |

**Літаратура**

1. Будзько, П.С. Тыпалогія састаўных айконімаў (на матэрыяле беларускай і нямецкай моў) / П.С.Будзько // Беларуская анамастыка: Зб. артыкулаў. – Мінск, 1985. – С. 52-67.
2. Лемцюгова, В.П. Беларуская айканімія. Лінгвістычны аналіз назваў населеных пунктаў Мінскай вобласці / В.П.Лемцюгова. – Мінск : “Навука і тэхніка”, 1970. – 156 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ